5. *Карскій Е. Ф.* Бјлоруссы. В 3 т. Варшава; 1903—1922. Т. 1. Введеніе въ изученіе языка и народной словесности. 1903.
6. *Пыпинъ А. Н.* Исторія русской этнографіи. В 4 т. СПб., 1890—1892. Т. 2. Общій обзоръ изученій народности и этнографія великорусская. 1891; Т. 4. Бјлоруссія и Сибирь. 1892.
7. *Романовъ Е.* Бјлорусскій сборникъ. Кіевъ—Витебскъ, 1886. Вып. 1.

Summary

*This article contains data on history of creation of the folkloristics one shot of P. Bessonov «The Belarus songs» (1871). The culturological aspects of scientific views of P. Bessonov are analysed. Sights of the scientist are connected with such direction in ethnology of 19 centuries as mythological school.*

*УДК 392*

***М. А. Бабчанок***

# СЕМАНТЫКА І ЗМЕСТ АКАЗІЯНАЛЬНЫХ АБРАДАЎ І ЗВЫЧАЯЎ

Беларуская народная абраднасць — асноўная і неад'емная частка духоўнай культуры беларусаў. Яна з'яўляецца адной з самых багатых крыніц, у якой захаваны гісторыя і быт народа, яго мары і надзеі, маральныя і эстэтычныя ідэалы, грамадскі вопыт і творчая спадчына. Абрады і звычаі замацоўваюць дасягненні асабістага і грамадскага жыцця, яны з'яўляюцца сродкам стабілізацыі, перадачы новым пакаленням і адлюстравання ў жыцці міжасабовых і грамадскіх адносін. Устойлівасць абрадаў забяспечвае захаванне для будучых пакаленняў дасягненняў духоўнай культуры, лепшых узораў працы, эталонаў дзеянняў, пачуццяў. Таму вывучэнне беларускай абраднасці з'яўляецца важнай задачай беларускай фалькларыстыкі.

У савецкай фалькларыстыцы вылучаліся каляндарная і сямейная абраднасць. Існуюць розныя віды класіфікацый абрадаў. Напрыклад, беларускі этнограф В. С. Цітоў вылучае наступныя групы абрадаў:

1. Вытворчыя (уключаюць аграрна-каляндарныя і прамысловыя);
2. Сямейна-бытавыя (радзіны, вяселле, наваселле, пахаванне);
3. Грамадзянскія (звязаныя са знамянальнымі падзеямі, юбілеямі, датамі) [7, с. 9 — 11].

Некаторыя даследчыкі да асобнай групы адносяць рэлігійныя абрады.

Аднак у працах беларускіх фалькларыстаў і этнографаў аказалася па-за класіфікацыяй група абрадаў, якія не ўваходзяць у каляндарны і сямейны цыклы, але маюць шмат агульнага і адрозніваюцца характэрнымі асаблівасцямі. Рускі даследчык К. В. Чыстоў у працы «Да класіфікацыі абрадаў жыццёвага цыклу» [10] прапануе вылучыць у асобную групу аказіянальныя абрады.

Аказіянальныя (лац. occasionalis — выпадковы) — гэта абрады, якія ўзнаўляюцца ў быце не рэгулярна, а толькі па ступені неабходнасці ці ўзнікнення асобных, часцей крытычных, крызісных акалічнасцей. Яны характарызуюцца рухомасцю, своеасаблівым характарам працякання абрадавага часу, залежным ад жыццёвых абставін, якія выклікалі правядзенне дадзеных абрадаў. Залежнасць аказіянальнай абраднасці ад тых сітуацый, якія часцей узнікаюць без жадання чалавека або па неабходнасці, абумоўлівае спецыфіку і накіраванасць яе правядзення. Абрадавым дзеянням і вербальным тэкстам уласцівы кансерватызм і архаічнасць (трываласць і ўстойлівасць), якія звязаны з тым, што аказіянальныя абрады праводзяцца з нагоды сітуацый, выкліканых парушэннем звыклага жыцця чалавека і ўзнікнення вострай неабходнасці яго змянення. Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння падкрэсліваўся асаблівымі прыкметамі: паўторамі тэкстаў і дзеянняў, абмежаваннем полу і ўзросту выканаўцаў, здзяйсненнем руху па коле, па крыжы і інш. Абрадавымі сродкамі выступалі розныя матэрыяльныя рэчы, рытуальная ежа, вада, нават жывёлы і птушкі, якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролю.

Такім чынам, аказіянальная абраднасць мае адметныя спецыфічныя прыметы:

- наяўнасць магчымасці ўздзеяння на сітуацыю, якая патрабуе змянення;
- мэтанакіраванасць рытуальных дзеянняў — зберагальныя, ачышчальныя абрады і г. д.;
- своеасаблівы характар працякання абрадавага часу, рухомасць, выкананне абрадаў па ступені неабходнасці;
- узаемасувязь кампанентаў абрадаў — абрадавых дзеянняў, вербальных тэкстаў,

музычных і гукавых кампанентаў, матэрыяльных рэчаў і г. д.;

- шматварыянтнасць правядзення абрадавых дзеянняў у разнастайных рэгіёнах краіны.

Аказіянальныя абрады праводзяцца па неабходнасці або выпадковасці пасля факта здарэння сітуацыі, так сказаць «постфактум», і маюць сваёй мэтай спробу ўздзеяння на яе. Таму гэты від звычаю можна ўмоўна падзяліць паводле тых абставін, якія выклікалі неабходнасць правядзення таго ці іншага аказіянальнага абраду:

1. Аказіянальныя абрады, неабходнасць правядзення якіх выклікана катаклізмамі надвор'я, такімі як:
   — *мароз*. Звычаі яго заклінання заснаваны на лічэнні лысых, пры гэтым ужываліся спецыяльныя слоўныя формулы з выкарыстаннем імён знаёмых лысых [5, с. 60].
   — *град*. На яго суцішэнне або прадухіленне былі накіраваны абрады, звязаныя з «сустрэчай» граду хлебам-соллю, з выкарыстаннем хлебнай лапаты і іншых сімвалічных прадметаў: грамнічных свечак, асвечанай вярбы, ручніка і г. д. [5, с. 62, 77].
   — *бура*, *навальніца*. З мэтай абароны хаты ад udараў Перуна, супраць «раз'юшанай буры», «каб разагнаць навальнічныя хмары», праводзіліся абрады, якія таксама звязаны з пачуццём страху, якое выклікалі вышэйназваныя з'явы прыроды. Магічнае ўздзеянне былі прызваныя зрабіць дзеянні з грамнічнымі свечкамі, асвечанымі зёлкамі, гарачым вуголлем, вербнымі галінкамі, хлебнай лапатай і інш. [5, с. 74 — 75, 79].
   — *дождж, паводка*. Правядзенне такіх абрадаў было выклікана дажджлівым надвор'ем, яны былі накіраваны, каб спыніць дождж і адагнаць хмары. Сімвалічнымі прадметамі ў гэтых абрадах выступалі асвячоныя косці або мяса, якія закопваліся ў зямлю або спальваліся, драўляная лапата, дзяжа і інш. [5, с. 76, 78, 81].
   — *засуха*. Да ліку аказіянальных абрадаў адносяцца звычаі выклікання дажджу ў час засухі: сімвалічнае заворванне або баранаванне вадаёма, які высах, дарогі, забіванне жабы, вужа, рака, крата, разбурэнне мурашніка і інш. Падобныя рытуалы вядомы і іншым народам: індыйскім, паўднёвым славянам, абхазцам. Прычынай засухі часцей лічылі пахаванне чалавека, які памёр не сваёй смерцю, і таму на могілках праводзіліся абрадавыя дзеянні з вадой [5, с. 87—88]. Увогуле вада ў абрадах выклікання дажджу займала вядучае месца, а таксама тыя прадметы, якія былі з ёю звязаны: вядро, калодзеж, бутэлька, гладыш і г. д.
   — *маланка*. Дзеля забеспячэння абароны ад udараў маланкі, якая магла выклікаць пажар, праводзіліся абрады, якія звязаны з захаваннем грамавых стрэл [5, с. 67, 496].
2. Аказіянальныя абрады, якія праводзіліся з нагоды сітуацый, звязаных са здароўем чалавека: хваробы, эпідэміі, моры. У мэтах іх прадухілення выкарыстоўваліся замовы, спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якія праводзіліся падчас захворванняў, распаўсюджвання эпідэміі. Напрыклад, звычай ахвяравання ў касцёл або царкву «абыдзённай наміткі», якую ткалі жыхаркі вёскі за адзін дзень дзеля засцярогі ад розных хвароб [6, с. 167].
3. Аказіянальныя абрады, правядзенне якіх абумоўлена бытавымі сітуацыямі, такімі як:
   — *капанне калодзежа*. У мэтах забеспячэння чысціні і паўнаты крыніцы праводзяцца абрады, звязаныя з культам вады, з выкарыстаннем магічных дзеянняў з арэхамі, хлебам, авечай воўнай і г. д. [5, с. 531].
   — *будаўніцтва хаты*. Пры ўзнікненні такой неабходнасці праводзіліся абрады, накіраваныя на забеспячэнне добрага і шчаслівага жыцця людзей у новай хаце і жывёлы ў хлявах. Чалавек нязменна арыентаваўся на вераванні, звязаныя з выбарам месца для будаўніцтва, матэрыялаў на пабудову хаты, праводзіў абрадавыя дзеянні падчас закладзін, улазін, або ўводзін і інш. [5, с. 519—531].
   — *пажар*. Абрады, накіраваныя супраць узнікнення пажару або каб спыніць яго пашырэнне, «каб задобрыць агонь», былі звязаны з сімвалічнай ахвярай агню. У якасці ахвяры выкарыстоўваліся хлеб, малако, асвечанае велікоднае яйка і іншае [5, с. 500].

З'яўленне аказіянальных абрадаў — гэта своеасаблівая рэакцыя на тыя жыццёвыя абставіны, якія чалавек быў непадуладны змяніць без прыцягнення спецыяльных спо-

сабаў, якія мелі магічны сэнс, меркаванне людзей пра магчымасці абрадавых дзеянняў як сродкаў прамога ўздзеяння чалавека на прыроду.

Аказіянальная абраднасць адметная не толькі ўплывам характару сітуацыі, якая выклікала неабходнасць правядзення таго ці іншага аказіянальнага абраду, але і разнастайнасцю выкарыстання сродкаў магчымага на яе ўздзеяння. Часцей за ўсё, акрамя вербальнай часткі абраду, з гэтай мэтай шырока выкарыстоўваліся розныя матэрыяльныя рэчы (свечкі, ручнік, лапата, посуд і інш.), рытуальная ежа і расліны (мак, бабы, гарох, капуста і інш.), вада, агонь, зёлкі, нават жывёлы і птушкі (жаба, вуж, крот, вусень і інш.), якія выконвалі ў абрадзе сімвалічную аберагальную і ачышчальную ролю.

Аказіянальныя абрады цесна звязаны з аграрна-каляндарнымі і сямейна-бытавымі звычаямі, яны даволі часта пераплятаюцца, узаемапранікаюць і дапаўняюць адзін аднаго. Некаторыя з іх трансфармаваліся ў дзіцячыя песні, гульні і іншыя жанры. У дзіцячых заклічках і прыгаворках ёсць нямала падобных твораў з архаічнымі зачынамі: «Дождж, дожджык, секані (сыпані, крапані, перастань)...», «Ідзі, ідзі, дожджыку, зварым табе боршчыку...», «Даждзёк, даждзёк, прыпусты: мы схуваемся ў кусты...», «Мядзведзь, мядзведзь, разгані тучу: дам табе аўса кучу» [3, с. 434].

Такім чынам, беларуская аказіянальная абраднасць з'яўляецца багатай нацыянальнай скарбніцай, якая яшчэ мала вывучана, а таму патрабуе асаблівай увагі з боку навукоўцаў у галіне беларускай фалькларыстыкі.

### Літаратура


1. *Барташэвіч Г. А.* Магічнае слова: Вопыт даследавання спетапоглядной і мастацкай асновы замоў. Мн., 1990.
2. *Борейко В. Е., Грищенко В. Н.* Экологические традиции, поверья, религиозные поверья славянских и других народов. Киев, 1999. Т. 2.
3. Гульні, забавы, ігрышчы. 2-е выд. / склад. А. Ю. Лозка. Мн., 1996.
4. Дзіцячы фальклор / склад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1972.
5. Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пер., бібл. У. Васілевіча. Мн., 1996. Кн. 1.
6. Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. Мн., 1999. Кн. 3.
7. Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова. Мн., 2002.
8. Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі : матэрыялы / Міжнар. навук. канф. Мн., 2003.
9. *Сысоў У. М.* Беларуская пахавальная абраднасць. Мн., 1995.
10. *Чистов К. В.* К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Л., 1990.



### Summary

*The concept of occasional rituals on the basis of ceremonles reproducing in the way of life as far as possible or because of rising special often crisis or critical circumstances, are examined. Special specific signs of occasional ritual actions and verbal texts are defined, the classlfication of occasional ceremonies, depending on the necessity of their carrylng out, is given.*